# «Я АДЧУВАЮ АДКАЗНАСЦЬ ЗА ГЭТЫ КУТОК НАШАЙ АГУЛЬНАЙ АЙЧЫНЫ»



**Які гістарычны шлях і якія сучасныя задачы звязваюць Беларусь і Калінінградскую вобласць**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЧЭРВЕНЯ АЎТОРАК № 110 (30498)



# СІМВАЛ МОЦНАГА БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКАГА СЯБРОЎСТВА

**Беларусы атрымалі цудоўны падарунак — Нацыянальны футбольны стадыён**

Спартыўнай сталіцы — больш спартыўных аб'ектаў. У Мінску ўрачыста адкрылі Нацыянальны футбольны стадыён. Удзел ва ўрачыстай цырымоніі прыняў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

СТАР. 2–3

МОЛАДЗЬ ВЫБІРАЕ ПРАЦУ

8–9



ПАДЗЕЯ

## ЛЕТА ПАЧЫНАЕЦЦА З «ВЫТОКАЎ»

**Спартыўна-культурны фестываль прайшоў у Паставах 5–7 чэрвеня**

Яркая насычаная праграма падарыла гасцям і ўдзельнікам мерапрыемства шмат пазітыву і энергіі. Інтэрактывы, майстар-класы, канцэрты, квэсты... Але ж пра ўсё па парадку.

СТАР. 10



**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**



Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

**Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

ISSN 1990 — 763X

# СІМВАЛ МОЦНАГА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Новая арэна разлічана на 33 тысячы гледачоў і стане самай вялікай у Беларусі. Стадыён адпавядае ўсім міжнародным стандартам і гатовы прымаць сустрэчы самага высокага ўзроўню. І, безумоўна, Нацыянальны футбольны стадыён — вельмі прыгожае і красамоўнае пацвярджэнне сяброўскіх і паважлівых адносін паміж Беларуссю і Кітаем. Таму разам з Прэзідэнтам Беларусі новую арэну адкрыў віцэ-прэзідэнт Алімпійскага камітэта КНР Чжан Цзяшэн.

Нягледзячы на святочную нагоду, кіраўнік дзяржавы гаварыў і аб надзённым. Першае пытанне — па прыездзе на арэну: «Калі будзем перамагаць?» Прэзідэнта запэўнілі, што найбліжэйшым часам. Недалёка ад уваходу на стадыён — скульптурная кампазіцыя двух футбалістаў. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што тут было б дарэчы размясціць помнік Старшыні КНР Сі Цзіньпіну. Менавіта дзякуючы дамоўленасцям на найвышэйшым узроўні кіраўнікоў Кітая і Беларусі стала магчыма будаўніцтва такой грандыёзнай спартыўнай арэны. Кіраўніку дзяржавы коратка далажылі аб рэалізацыі праекта і перспектывах стадыёна. Важна, што аб'ект пабудаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі міжнародных футбольных арганізацый ФІФА і УЕФА і ўжо распачата працэдура па атрыманні неабходных акрэдытацый. Прыведзена ў парадак і навакольная тэрыторыя — парк 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, пасля рэканструкцыі адкрыты футбольны стадыён «Трактар». Як адзначыў міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук, пра такі футбольныя стадыён можна толькі марыць. Бо нават у Еўропе мала арэн такога ўзроўню.



## КІТАЙЦЫ НІЧОГА ПРОСТА ТАК НЕ ГАВОРАЦЬ

На цырымоніі адкрыцця Аляксандр Лукашэнка выступіў з душэўнай прамовай. «Я вельмі шмат разоў, можа, дзясяткі, можа, сотні, праязджаў па нашым Партызанскім праспекце, сення ён стаў прыгожым, утульным (не заўсёды так было). Праязджаючы па гэтым праспекце, я заўсёды глядзеў на вялізны кавалак нашага Мінска, гэтага парку. А потым, будучы дэпутатам парламента, стаўшы Прэзідэнтам, я неаднойчы бываў у гэтым парку, у раёне нашага стадыёна «Трактар». І тады зарадзілася шалёная думка пабудаваць тут нешта самавітае для гэтага раёна, дзе жылі і, упэўнены, жывуць моцныя людзі, працаўнікі, ды і для нашага Мінска, — расказаў перад гісторыю кіраўнік дзяржавы. — А з часам, можа, праз 5-7 гадоў, я цвёрда вырашыў, пачуўшы вашу крытыку, што мы нібыта вельмі шмат аддаёмся хакею і будуем для хакея і гэтак далей. Вы памятаеце, да чэмпіянату свету (чэмпіянату свету па хакеі 2014 года. — **«Зв.»**) мы вымушаны былі будаваць. Я думаю: трэба ж для сваёй прафесіі, маладосці (а мая прафесія — гэта не хакей, а футбол), трэба пабудаваць нам нацыянальны стадыён. Ну некалі ж наша зборная пакажа клас гульні і будзе гуляць так, як належыць».

Аляксандр Лукашэнка распавёў, што пасля прыняцця рашэння аб будаўніцтве тут футбольнага стадыёна на перагаворах у Пекіне са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам зайшла размова на гэту тэму. «І ён так па-кітайску, а кітайцы людзі вельмі спакойныя, ураўнаважаныя, у канцы таго, як я падзяліўся з ім думкамі, сказаў: «Мы падумаем». Я яго не прасіў тады», — распавёў ён. Пасля наступных перагавораў, па словах беларускага лідара, Сі Цзіньпін прадставіў макеты нацыянальнага футбольнага стадыёна і басейна міжнароднага ўзроўню — падарункі беларускаму народу ад Кітая. «Я адразу не паверыў, добра ведаючы Кітай, кітайцаў, не паверыў. А потым падумаў: кітайцы проста так дарма нічога не гавораць, а тым больш першая асоба. Вось з гэтага ўсё пачалося. Будавалі

# «Я АДЧУВАЮ АДКАЗНАСЦЬ ЗА ГЭТЫ КУТОК

## Які гістарычны шлях і якія сучасныя задачы звязваюць



Фота БелТА.

**Новы тыдзень у Палацы Незалежнасці пачаўся з прыёму гасцей і размовы на перспектыву. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Калінінградскай вобласці Аляксеем Бяспрозванных. Дэлегацыя гэтага рэгіёна з візітам знаходзіцца ў нашай краіне і наладжвае эканамічныя, гандлёвыя і прамысловыя сувязі, якія, несумненна, умацуюцца пасля перагавораў з кіраўніком нашай дзяржавы.**

«Нягледзячы на тое, што мы з вамі сустракаемся ўпершыню, вы ўжо другі раз у Беларусі, так што больш-менш знаёмы з нашай краінай і, самае галоўнае, з нашымі магчымасцямі», — прывітаў госця Аляксандр Лукашэнка. Традыцыйна беларускі лідар запэўніў, што, нягледзячы на розныя памеры эканомікі, тэрыторыі, Беларусь заўсёды падставіць плячо.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў: у савецкія часы наша краіна была адказная за Калінінградскую вобласць і за ўсё, што там адбывалася, адказвалі беларусы. Прэзідэнт заўважыў, што, хоць мы даўно жывём у суверэнных незалежных дзяржавах, гэта пачуццё адказнасці застаецца: «Я, паверце, адчуваю адказнасць, як і беларусы, за гэты куток нашай агульнай Айчыны. Таму вы можаце на нас спадзявацца ва ўсім, на што мы здольныя ў Беларусі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

### НЕ ПАДАЦЬ У ТАВАРААБАРОЦЕ, А ПАКАЗВАЦЬ ПРЫКЛАД

Прэзідэнт звярнуў увагу, што апошнім часам адбылося зніжэнне экспарту паміж Беларуссю і Калінінградскай вобласцю. У 2024 годзе ён склаў 234 мільёны долараў, а ў 2023-м — 345 мільёнаў. Гэта звязана ў тым ліку і са зніжэннем экспартных паставак з Беларусі. «Вы як добры прамысловец, наколькі я ведаю, разумееце, пра што ідзе гаворка. І прыкладзяце ўсе намаганні, дапаможаце. Падкажаце для таго, каб мы ўсё ж такі не падалі ў нашым тавараабароце, а паказвалі прыклад іншым. Мы таксама будзем старацца, каб дасягнуць як мінімум таго, што было ў нас», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

### АПК, БУДАЎНІЦТВА, ПРАМЫСЛОВАСЦЬ — ДРАЙВЕРЫ РОСТУ

А для гэтага ў тым ліку неабходна вырашыць некаторыя лагістычныя праблемы, на якія звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. Беларускія тавары сельскай гаспадаркі і прамысловасці патрэбныя Калінінградскай вобласці. Аляксандр Лукашэнка зноў звярнуўся да гісторыі і нагадаў, што так будавалася народная гаспадарка ў свой час — беларусы многае выраблялі для Калінінградскай вобласці. «Сёння пастаўкі ажыццяўляем, спачатку вязём на поўнач, потым — на паўднёвы захад у Калінінградскую вобласць. Але гэта не апраўданне таго, што мы крыху «звалілія» апошнім часам. Нашы магчымасці вы ведаеце», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у свой час беларусы і калінінградцы разам будавалі ЦЭЦ у Калінінградскай вобласці. Таму сёння можна развіваць супрацоўніцтва ў будаўнічай сферы.

«Мы пастаўлялі і, спадзяюся, будзем пастаўляць вам пасажырскую тэхніку ўсіх класаў: і аўтобусы, і электробусы, і трамваі, і тралейбусы — усё, што трэба для Калінінградскай вобласці. Мы гэта ўмеем рабіць. Мы захавалі тыя кампетэнцыі, якія былі ўласцівыя нам у савецкія часы, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я недарма намякнуў на тое, што вы ўчарашні намеснік міністра прамысловасці. Таму вы добра ведаеце, што без станкоў у прамысловасці нічога не бывае. Мы захавалі з савецкіх часоў наш узровень вытворчасці станкоў. Станкабудаўнічая галіна ў нас прыстойная, і мы дадалі прыстойна ў гэтым плане. Мы вырабляем і такарныя, і фрэзерныя, і шліфавальныя, і іншыя станкі». Прэзідэнт звярнуў увагу, што цяпер станкабудаванне — вельмі вялікая праблема і для Беларусі, і для Расіі. Адна з беларуска-расійскіх праграм накіравана на развіццё гэтай галіны прамысловасці, зрабіў акцэнт беларускі лідар. Тым больш не ўсё страцілі, што засталося з савецкіх часоў.

Яшчэ адзін кірунак, агучаны кіраўніком дзяржавы, — ліфтабудаванне. Гэта праблема актуальная як для Беларусі, так і для Расіі, паколькі ёсць неабходнасць у замене ліфтаў, устаноўленых яшчэ ў савецкія часы. «Вельмі вялікія чэргі ў постсавецкіх рэспубліках на закупкі ліфтаў, іх пастаянна не хапае. Але будзьце ўпэўненыя, што для Калінінградскай вобласці, калі гэта трэба будзе, мы вырабім патрэбную колькасць ліфтаў», — запэўніў Прэзідэнт.

Абмеркавалі і пастаўкі прадуктаў харчавання, у вытворчасці якіх Беларусь дасягнула прыстойнага ўзроўню. «Будзьце ўпэўненыя, што, нягледзячы на некаторыя праблемы з лагістыкай, мы патрэбную колькасць пастаўкаў прадуктаў харчавання ўсялякіх, у тым ліку

# БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКАГА СЯБРОЎСТВА

адносна хутка. Басейн міжнароднага ўзроўню вы бачылі — поўнасцю падарунак кітайскага народа, там няма беларускіх грошай», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што гэты шыкоўны аб'ект адкрыты толькі дзякуючы яго сябру — Старшыні КНР Сі Цзіньпіну.

## «ДЛЯ НАШАЙ КРАІНЫ ГЭТА НАЙВЯЛІКШАЯ ПАДЗЕЯ»

«І вось сёння мы адкрываем гэта грандыёзнае збудаванне. Для нашай краіны, для Беларусі, гэта найвялікшая падзея. Гэтая цудоўная арэна, як і новы басейн міжнароднага ўзроўню, спраектаваныя і пабудаваныя нашымі сябрамі з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Я яшчэ раз афіцыйна хачу падзякаваць Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіну, а таксама ўсім кітайскім партнёрам, будаўнікам. Хачу падзякаваць за ўзвядзенне самага вялікага і сучаснага футбольнага стадыёна краіны, які спалучае нацыянальныя традыцыі і перадавыя інжынерныя рашэнні», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама падзякаваў і футбалістам, якія прыехалі на матч з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што беларускі бок зробіць усё, каб гасцям тут спадабалася.



«Перакананы, гэты стадыён стане яшчэ адным вядомым вобразам нашага горада-героя Мінска і сімвалам моцнага беларуска-кітайскага сяброўства. Гэты спартыўны аб'ект адпавядае самым высокім сусветным стандартам. Я спадзяюся, што ў недалёкай будучыні разам з таварыскімі гульнямі і матчамі нацыянальнага чэмпіянату мы зможам прымаць тут афіцыйныя міжнародныя сустрэчы і атрымліваць асалоду ад выступлення найлепшых футбалістаў свету», — заўважыў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што мінчане правялі добраўпарадкаванне прылеглага парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і абнавілі інфраструктуру стадыёна «Трактар». Але, па яго словах, гэта яшчэ не канец. Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на тым, што трэба прыкласці яшчэ шмат працы, каб гэты стадыён патанаў у зеляніне і кветках. Такая задача ўжо пастаўлена кіраўніцтву горада. «Каб гэты зялёны куток сталіцы літаральна за пяцігодку ператварыўся ў сучасны спартыўны квартал для аматараў актыўнага адпачынку», — удакладніў Прэзідэнт.

## «ФУТБОЛ СЦІРАЕ МЕЖЫ ПАМІЖ КРАІНАМІ»

«Спорт справядліва лічаць пасылам міру. Футбол — самая папулярная масавая народная гульня — сцірае межы паміж краінамі, зближае розных людзей, аб'ядноўвае і тых, хто гуляе, і тых, хто заўзее, — усіх нас. Спадзяюся, узровень гульні нашых клубаў і асабліва зборных будзе адпавядаць створаным для іх умовам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

***(Заканчэнне на 4-й стар.)***

### У тэму

**Першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў** у праекце «Час Першага» на тэлеканале «Беларусь 1» расказаў падрабязнасці праведзенай нядаўна ў Пекіне сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні КНР Сі Цзіньпіна, паведамляе БелТА.

У прыватнасці, ён прывёў фразу, сказаную кітайскім лідарам у час непублічнай часткі сустрэчы: «Мой сябар, у нас з табой асаблівыя адносіны, таму і абед у нас сёння будзе сямейным. І ўпершыню ў гісторыі на гэтым абедзе вось у такім ключы, з замежным лідарам, будзе прысутнічаць мая дачка».

«Як вы думаеце, якія адносіны і ў якой атмасферы праходзіў візіт, сустрэча, абед, калі была яго дачка, калі была Пэн Ліюань (жонка Сі Цзіньпіна. — **«Зв.»**), калі быў таварыш Сі Цзіньпін сам? — задаў рытарычнае пытанне Мікалай Снапкоў. — Сустрэліся два сябры, два лідары, два чалавекі, у якіх энергія аднолькавая. Гэта не пафас. Яны адзіныя ў разуменні жыцця, у разуменні палітыкі, у разуменні развіцця, у разуменні адказнасці за свае народы. Сустрэча была душэўная, сустрэча была цудоўная, сустрэча была фантастычная».

# НАШАЙ АГУЛЬНАЙ АЙЧЫНЫ»

## Беларусь і Калінінградскую вобласць

і бульбы», — падкрэсліў Прэзідэнт. На бульбу, якая апошнім часам выклікае асаблівую занепакоенасць у інтэрнэце, ён звярнуў асаблівую ўвагу. «Сёння ўрад далажыў, што свежая маладая беларуская бульба на прылаўкі пайшла», — паведаміў кіраўнік дзяржавы.

## «НЕ БУДЗЕМ ЧУЦЬ ЛЮДЗЕЙ — БУДЗЕ ДРЭННА»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што галоўнае — людзі. «Мы для гэтага і працуем. Не будзем чуць людзей — будзе дрэнна. Калінінградцы — людзі нашы, вы заўсёды пра гэта ведалі», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што немагчыма палічыць, колькі сярод жыхароў Калінінградскай вобласці і ў цэлым сярод расіян беларусаў. Але відавочна, што іх вельмі шмат. «Калінінградцы — разумныя, працавітыя, мудрыя людзі. Прыкладна такія, як беларусы, — заўважыў Прэзідэнт. — Можам дзесьці недапрацаваць, але ў нас ёсць у каго вучыцца: давайце будзем шчырыя, еўрапейцы ў гэтым плане малайцы. Я часта прыводжу ў прыклад дэфіцыт працоўных рэсурсаў. Паехалі да нас людзі з вядомых рэгіёнаў. Нашы кажуць: «Ну як гэта так?». Кажу: «Добра, ніякіх мігрантаў, але тады прадукцыйнасць працы патрэбна як у Еўрасаюзе — у 3-5 разоў вышэйшая». Чаму? Таму што калі мы не будзем канкурэнтнымі з Еўрапейскім саюзам, нам няма чаго там рабіць. Асабліва Калінінграду і Беларусі, бо ў нас тая эканоміка, якая ўласцівая ўсяму Еўрапейскаму саюзу, і з ім трэба канкурыраваць». Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што ўсе жыццёвыя праблемы будуць вырашаны, галоўнае — не ствараць дадатковых цяжкасцяў. «У нас на вялізнай прасторы нашай Айчыны патрэбна ўсё. Не назавеш ніводнага тавару, які б нашым людзям быў не патрэбны. На гэта трэба арыентавацца. А тое, што прададзім там, за мяжой, у плюс», — адзначыў ён.

## ГІСТАРЫЧНА МЫ РАЗАМ, ЯК БРАЦКІЯ НАРОДЫ, ЖЫЛІ І БУДЗЕМ ЖЫЦЬ

Аляксей Бяспрозванных адзначыў, што ў склад дэлегацыі ўвайшлі кіраўнікі ключавых сфер, сярод іх — тры члены ўрада Калінінградскай вобласці, якія нарадзіліся ў Беларусі. «Гістарычна мы разам, як брацкія народы, жылі і будзем жыць», — падкрэсліў губернатар. Аляксей Бяспрозванных расказаў, што гэта яго другі візіт у Беларусь. Летась, падчас наведвання Магілёўскай вобласці, было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве з улікам сучасных рэалій. «Такія пагадненні ў нас падпісаныя з усімі абласцямі. І наш рэгіён актыўна супрацоўнічае з усімі», — паведаміў ён. Губернатар звярнуў увагу, што на маючым адбыцца Форуме рэгіёнаў у Ніжнім Ноўгарадзе гэтыя дакументы будуць актуалізаваны. Напрыклад, у супрацоўніцтве з Гродзенскай вобласцю (як і з іншымі рэгіёнамі) стаіць задача дасягнуць дасанкцыйнага ўзроўню тавараабароту.

Аляксей Бяспрозванных звярнуў увагу, што зніжэнне тавараабароту адбылося перш за ўсё з-за абмежаванняў, уведзеных недружалюбнымі суседзямі. Паводле яго слоў, менавіта яны не даюць цалкам раскрыць патэнцыял. З-за стварэння штучных бар'ераў назіраецца зніжэнне патоку аўтамабільнага і чыгуначнага транспарту. «Але ў нас бізнес падстроіўся, адаптаваўся, не гэтымі каналамі, дык іншымі будзем вазіць прадукцыю. З аднаго боку, абмежаванні для нас няпростыя, але, з другога боку, дазваляюць развіваць і марскія зносіны, якія раней так не развіваліся. Мы пераключыліся на марскія зносіны, і ўсе тыя грузы, якія не дазваляюць нам перавозіць сухапутным шляхам, мы перавозім морам», — распавёў губернатар Калінінградскай вобласці.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

#### АБМЕЖАВАННІ АД НЕДРУЖАЛЮБНЫХ СУСЕДЗЯЎ НЕ СТАНУЦЬ АБМЕЖАВАННЯМІ ДЛЯ РОСТУ ТАВАРААБАРОТУ

Журналістам **Аляксей Бяспрозванных** расказаў пра найбольш перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва. Адзін з іх — меліярацыя: 70 % меліяраваных зямель Расіі знаходзіцца менавіта ў Калінінградскай вобласці, таму для рэгіёна гэта вельмі актуальна, а ў Беларусі ёсць вопыт і тэхналогіі. «У нас вельмі любяць беларускую малочную і мясную прадукцыю. Ведаю, што беларускія спажыўцы любяць нашу рыбную прадукцыю. Абмеркавалі, што ў гэтых адносінах будзем нарошчваць тавараабарот», — адзначыў губернатар. Абмяркоўваецца і шэраг праектаў у прамысловай сферы. «Думаю, што абмежаванні ад нашых недружалюбных суседзяў не будуць абмежаваннямі паміж ростам тавараабароту Беларусі і Калінінградскай вобласці», — упэўнены Аляксей Бяспрозванных. Губернатар адзначыў, што для Калінінградскай вобласці сёння вельмі актуальнае пытанне электрыфікацыі транспарту. «Мы гатовыя прапанаваць сваю батарэю для таго, каб яна выкарыстоўвалася ў транспарце ў Беларусі, і абмеркаваць звязаныя з гэтым праекты. Мы маем намер правесці шэраг перагавораў на гэту тэму», — удакладніў Аляксей Бяспрозванных.

#### «ВАШ ВІЗІТ — ВАЖНЫ КРОК ВА ЎМАЦАВАННІ СУВЯЗЯЎ ПАМІЖ НАШЫМІ БРАЦКІМІ НАРОДАМІ»

**Намеснік Прэм'ер-міністра Юрый Шулейка** правёў сустрэчу з губернатарам Калінінградскай вобласці Алексеем Бяспрозванных.

«Беларусь валодае дастатковымі рэсурсамі, каб забяспечыць патрэбнасці Калінінградскай вобласці ў сучасных грузавых, пасажырскіх, дарожна-будаўнічых і камунальных машынах і абсталяванні. Перспектыўным напрамкам у сферы прамысловай кааперацыі можа стаць удзел беларускіх вытворцаў у праграмах імпартазамяшчэння і лакалізацыі вытворчасці ў аўтамабілебудаванні для пастаўкі неабходных камплектуючых», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Ён таксама адзначыў, што з улікам цікавасці калінінградцаў да якасных беларускіх прадуктаў харчавання наша краіна гатова пастаўляць у рэгіён неабходныя аб'ёмы мяса-малочнай прадукцыі, сметанковага масла, гародніны, цукру, кандытарскай і іншай харчовай прадукцыі.

«Прамысловае садоўніцтва — гэта яшчэ адзін кірунак, у якім мы і далей гатовыя супрацоўнічаць з вашымі аграрыямі. Тым больш, што беларускія саджанцы сталі асновай для шэрагу садоў у рэгіёне», — рэзюмаваў Юрый Шулейка.

# СІМВАЛ МОЦНАГА БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКАГА СЯБРОЎСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асобна ён звярнуўся да маладых футбалістаў: «Вы маладыя, вам гуляць, вам адстойваць гонар роднай зямлі. А беларускія футбалісты, атрымаўшы такі падарунак, нарэшце, пачнуць апраўдваць нашы чаканні, і мы ўбачым з гэтых трыбун яркія перамогі любімых каманд».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларусы ўмеюць гуляць у футбол. І заўважыў, што тое, як трэба перамагаць самых моцных супернікаў, бліскуча паказала наша мужчынская зборная па пляжным футболе на нядаўнім чэмпіянаце свету.

«Віншую ўсіх з адкрыццём гэтага цудоўнага збудавання, гэтага стадыёна. Жадаю моцнага здароўя, упартасці і цярпення на шляху да вялікіх спартыўных дасягненняў на карысць нашай Радзімы», — падсумаваў Прэзідэнт.

## «МЫ НАПІСАЛІ АГУЛЬНУЮ ГЛАВУ БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКАГА СЯБРОЎСТВА»

Віцэ-прэзідэнт Алімпійскага камітэта КНР Чжан Цзяшэн падкрэсліў, што дзякуючы двум лідарам — Сі Цзіньпіну і Аляксандру Лукашэнку — адносіны Беларусі і Кітая выйшлі на найвышэйшы ўзровень усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. Ён звярнуў увагу, што нядаўна адбыўся паспяховы візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай, падчас якога лідары дамовіліся аб далейшай інтэсіфікацыі беларуска-кітайскіх адносін, быў створаны трывалы фундамент для ўстойлівага і доўгатэрміновага супрацоўніцтва. «Адкрыццё футбольнага стадыёна — гэта не толькі значны праект тэхніка-фінансавага ўзаемадзеяння, але і яркі прыклад палітычнага даверу і глыбокага сяброўства паміж нашымі народамі. Дзякуючы яднальнай сіле спорту, мы напісалі новую агульную главу ў гісторыі беларуска-кітайскага сяброўства», — сказаў ён. Чжан Цзяшэн падзякаваў будаўнікам двух краін, якія працавалі над рэалізацыяй праекта. «Упэўнены, што стадыён стане пляцоўкай для натхнення моладзі і новым крокам для ўмацавання гуманітарнага супрацоўніцтва Кітая і Беларусі. Няхай спорт збліжае нас, а наша партнёрства вядзе да агульнай будучыні», — адзначыў ён.



Чжан Цзяшэн перадаў сімвалічны ключ ад спартыўнага аб'екта Прэзідэнту Беларусі. А ён у сваю чаргу перадаў яго спартсменам. Яны падзякавалі за такі цудоўны падарунак, падтрымку спорту і запэўнілі, што зробяць усё магчымае, каб сваімі перамогамі праславіць родную краіну. «Дзякуй. Мы пачакаем, мы спадзяёмся, што вы ніколі не засмуціце на гэтай цудоўнай арэне. І не толькі на гэтай», — выказаў пажаданні Прэзідэнт.

Гісторыя нацыянальнага футбольнага стадыёна пачалася таварыскім матчам паміж футбольнымі зборнымі Беларусі U-21 і Кітая U-22. За гульнёй назіраў і кіраўнік дзяржавы. Згулялі футбалісты ўнічыю з лікам 1:1. Першы гол на новым стадыёне забіў Мікіта Баранок. Але на 75-й хвіліне матча госці зраўнялі вынік.

**Галоўны трэнер беларускай зборнай Віталь ПАЎЛАЎ** адзначыў высокі ўзровень гульні, якая прынесла яго камандзе карысны досвед: «Каманда Кітая кваліфікаваная, з ёй працуе іспанскі трэнер, а гэта шмат аб чым кажа. Каманда саперніка вельмі дысцыплінаваная, і гуляць з ёй было няпроста. Большую частку часу мы валодалі ініцыятывай, былі моманты, калі трэба было і можна было забіваць, але не хапала выканання. Але для нас гэта важны перыяд падрыхтоўкі і нам было важна праверыць свае сілы на такім узроўні».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА і Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# «БЕЛАРУСЬ — ЦЫТАДЭЛЬ КУЛЬТУРЫ»

## Падрабязнасці выязнога пашыранага пасяджэння Прэзідыума

Тэма выязнога пасяджэння — «Духоўна-асветніцкая спадчына Ефрасінні Полацкай як фундаментальная аснова захавання традыцыйных каштоўнасцяў беларускага народа». Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падкрэсліла, што духоўнаму выхаванню падрастаючага пакалення ў нашай краіне ўдзяляецца вялікая ўвага. Яна заклікала ўдзельнікаў мерапрыемства да адкрытага і жывога дыялогу.



### «МЫ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ У НАШАЙ КРАІНЕ БЫЛІ МІР І ЗГОДА»

«Калі мы страцім сувязь з мінулым, разбурым асновы, на якіх узводзіўся падмурак нашага грамадства, пасяховага беларускага дома, мы незваротна страцім сябе, сваю незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць, усе тыя вялікія дасягненні, заваяваныя нашымі легендарнымі продкамі, — падкрэсліла спікер. — Год добраўпарадкавання, аб'яўлены ў Беларусі, — гэта не толькі пра грамадзянскія ініцыятывы, навядзенне парадку на зямлі, аднаўленне духоўных святынь і важных для ўсіх нас помнікаў гісторыі. Гэта яшчэ і глыбокае самаасэнсаванне, усведамленне прызначэння і адказнасці за выбар, які ў свой час зрабіла вялікая асветніца Ефрасіння Полацкая, даўшы пачатак фарміраванню традыцый і каштоўнасцяў беларускага народа, яго самаідэнтыфікацыі».

Па словах Наталлі Качанавай, у параўнанні з сітуацыяй у заходніх краінах, дзе зневажаюцца традыцыйныя сямейныя і духоўныя каштоўнасці, у Беларусі беражліва захоўваюць запаветы вялікай святой: «Толькі абапіраючыся на нацыянальную духоўна-маральную, гісторыка-культурную спадчыну, мы можам захаваць суверэнітэт Беларусі, забяспечыць далейшае ўстойлівае развіццё і росквіт нашага народа. Беларусь сёння — цытадэль традыцыйнай культуры і маралі».

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што з імем Прападобнай звязана адкрыццё першых адукацыйных устаноў, Спаса-Праабражэнскага храма, развіццё рамёстваў. «Амаль праз дзевяць стагоддзяў асоба Ефрасінні Полацкай застаецца маральным арыенцірам, які ўвабраў у сябе дабрадзейнасць, глыбокую любоў да Радзімы і міласэрнасць», — заўважыла яна.

Наталля Качанава канстатавала, што яшчэ на этапе станаўлення незалежнай Беларусі Прэзідэнт у ліку прыярытэтных кірункаў развіцця дзяржавы абазначыў адраджэнне гісторыка-культурнай спадчыны і нацыянальных святынь. Па ўсёй краіне сталі аднаўляцца, будавацца манастыры і храмы, рэстаўравацца гісторыка-культурныя каштоўнасці.

«Гэта работа сёння дае свае вынікі, — упэўнена спікер. — Любыя ініцыятывы і праекты па захаванні святых месцаў або выкладанні ў школах асноў духоўна-маральнага выхавання знаходзяць падтрымку ў дзяржавы і Беларускай праваслаўнай царквы».

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што наша краіна з'яўляецца

# ПРАЗРЫСТАСЦЬ ПАЗЫКОВАГА САЦЫЯЛЬНЫХ

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі шэраг

У першым чытанні прыняты законапраект «Аб змяненні законаў», якім прадугледжана ўнясенне змяненняў у Грамадзянскі кодэкс, законы «Аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі», «Аб рэкламе». Галоўная мэта законапраекта — рэалізацыя прынцыпу справядлівасці і абарона правоў грамадзян. Пры гэтым пазыковыя сродкі застануцца даступнымі для ўсіх.

### ПАЗЫКА — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

Як звярнуў увагу **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА,** людзі ўсё часцей выкарыстоўваюць пазыковыя сродкі для вырашэння надзённых пытанняў. «Таму дзяржава павінна прымаць неабходныя меры для таго, каб грамадзяне не трапілі ў так званую фінансавую кабалу», — адзначыў спікер. У новым законапраекце, у прыватнасці, прапануецца абмежаваць пазыку фізічным асобам у замежнай валюце, забараніць пазыку грамадзянам пад залог нерухомасці.

Устанаўліваецца забарона на выдзяленне пазык фізічным асобам індывідуальнымі прадпрымальнікамі і юрыдычнымі асобамі, якія не ажыццяўляюць мікрафінансавую дзейнасць, за выключэннем пазык уласным работнікам. Прадугледжана забарона і на пазыкі ў замежнай валюце паміж фізічнымі асобамі, а так сама ў эквіваленце замежных валют або ва ўмоўных грашовых адзінках (выключэнне складаюць блізкія сваякі). Забараняюцца пазыкі і пад залог адзінага жылога дома (кватэры). Устанаўліваюцца абмежаванні па памерах працэнтаў і няўстойкі (штрафу, пені), якія спаганяюцца па дагаворах пазыкі паміж фізічнымі асобамі.



«Юрыдычныя асобы, арганізацыі, найменні якіх утрымліваюць словы «пазыка», «мікрапазыка», «мікрафінансаванне», «грошы ў доўг» і якія не займаюцца мікрафінансавай дзейнасцю, павінны будуць на працягу 7 месяцаў пасля прыняцця законапраекта ўнесці змяненні ў статутныя дакументы — гэта значыць памяняць сваё найменне, — патлумачыў **член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Аляксей РАЙКО.** — Для таго, каб нашы грамадзяне не ўводзіліся ў зман гэтымі словамі і вытворнымі ад іх».

Устанаўліваецца забарона на выкарыстанне ў рэкламе рэкламадаўцаў, якія не з'яўляюцца мікрафінансавымі арганізацыямі, у тым ліку ў іх найменнях, слоў «пазыка», «мікрапазыка», «мікрафінансаванне», «грошы ў доўг» або вытворных ад гэтых слоў.

# ТРАДЫЦЫЙНАЙ І МАРАЛІ»

## Савета Рэспублікі, якое прайшло ў Полацку

апорай талерантнасці і цярпімасці. «Устойлівы міжканфесіянальны мір у Беларусі, адсутнасць рэлігійных канфліктаў, даступнасць храмаў, свабода веравызнання — у нас выбудавана такая канфігурацыя дзяржаўна-канфесіянальных адносін, якая пазбаўлена падстаў для канкурэнцыі, дыскрымінацыі або разладу, — падкрэсліла Наталля Качанава. — У суверэннай Беларусі пытанню падтрымання рэлігійнага і этнаканфесіянальнага дабрабыту заўсёды ўдзялялася самая сур'ёзная ўвага. Знаходзячыся на стыку дзвюх цывілізацый, Беларусь змагла пабудаваць міралюбівую, самастойную і незалежную дзяржаву для народа».

Не кожная краіна ў гэты неспакойны час можа разважаць пра мір і вечныя каштоўнасці. У Беларусі ж гэтаму пытанню надаецца вялікае значэнне. Наталля Качанава адзначыла, што ў Савета Рэспублікі склаліся моцныя сяброўскія адносіны з Беларускай праваслаўнай царквой. «Усё, што мы — і людзі, якія надзелены ўладай, і тыя, хто служыць у нашых храмах, — робім разам — гэта адна справа. Мы павінны зрабіць усё, каб у нашай краіне былі мір і згода».

### ДУХОЎНЫ ЦЭНТР ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

У Наваполацку плануюць адкрыць храм, дзе асноўнымі прыхаджанамі стануць дзеці. Мяркуецца, што храм стане цэнтрам духоўнага развіцця.

Як расказаў **біскуп Полацкі і Глыбоцкі Ігнацій,** дзіцячы садок № 6 будзе пераабсталяваны ў духоўны цэнтр з храмам у гонар прападобнага Сергія Раданежскага — апекуна навучэнцаў. «Чым ён будзе адрознівацца ад іншых? У першую чаргу, тым, што асноўнымі прыхаджанамі ў ім стануць дзеці, — адзначыў кіраўнік Полацкай епархіі. — Дзіцячы хор з Наваполацка будзе выконваць богаслужэнні. Іканастас будзе зроблены так, каб праглядалася ўсё, што адбываецца ў алтары. Дзеці атрымаюць наглядны навучальны дапаможнік. Акрамя таго, у гэтым цэнтры духоўнага развіцця будуць класы для заняткаў музыкай, нядзельная школа для збору маладзёжных брацтваў, а таксама актавая зала з кіназалай».

Ён адзначыў, што многія дзеці ведаюць і глядзяць розныя фільмы, дзе ў лёгкай і даступнай форме расказваецца аб жыцці святароў, кінастужкі на духоўную тэматыку з глыбокім зместам. Іх якраз і будуць паказваць у кіназале дзіцячага храма.

Прадугледжана ў ім і трапезная. «Мы назвалі яе маладзёжным кафэ, — удакладніў святар. — У зале змогуць сядзець па шэсць-восем чалавек за столікам, каб сем'і прыходзілі, дзяцей аддавалі на заняткі ў нядзельнай школе, а самі бацькі маглі перакусіць і паразмаўляць».

Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што гэта добрая ініцыятыва, якая дапаможа далучыць маладое пакаленне да традыцыйных праваслаўных каштоўнасцяў.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**
**Фота БелТА.**



# РЫНКУ І ПАВЫШЭННЕ ГАРАНТЫЙ

## заканадаўчых новаўвядзенняў



### БОНУСЫ ДЛЯ ІП

Праектам закона «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і пенсіённага забеспячэння», разгледжаным у другім чытанні, плацельшчыкам падатку на прафесійны даход даецца добраахвотнае права на штогадовай аснове ажыццяўляць даплату абавязковых страхавых узносаў на пенсіённае страхаванне для фарміравання сваіх будучых пенсіённых правоў.

У адносінах да індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі падаходнага падатку, устанаўліваецца гнуткі парадак выплаты абавязковых страхавых узносаў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Памер узносаў выплачваецца з фактычнага даходу для ІП, у якіх у каляндарным годзе даход склаў менш як 12 мінімальных заработных плат (МЗП), і з 12 МЗП або іншай сумы, якая перавышае гэты парог, — для ІП, у якіх даход за каляндарны год склаў 12 МЗП і больш.

### ПЕНСІЁННЫЯ НАВАЦЫІ

Мяняюцца правілы выплаты пенсій асуджаным да пазбаўлення волі. Пры змяшчэнні пенсіянера ў месца пазбаўлення волі прызначаную яму пенсію ў поўным аб'ёме будуць пералічваць у папраўчую ўстанову па месцы адбывання пакарання. Усе неабходныя ўтрыманні з пенсіі, у тым ліку кошт утрымання, будуць ажыццяўляцца папраўчай установай. Сёння пенсіённыя органы вылічваюць кошт утрымання і ў папраўчую ўстанову пералічваецца 10 % пенсіі. Што датычыцца непаўналетніх, асуджаных да пазбаўлення волі, якія атрымліваюць пенсію па інваліднасці або ў сувязі са стратай карміцеля, 50 % пенсіі будзе пералічвацца на іх асабовы рахунак у папраўчую ўстанову і 50 % пенсіі — іх законнаму прадстаўніку.

У ходзе падрыхтоўкі праекта закона ў яго ўключаны палажэнні, якія суадносяцца з Указам Прэзідэнта № 402 «Аб сацыяльнай падтрымцы», які дзейнічае з 1 студзеня 2025 года.

У адпаведнасці з нормамі ўказа змяненні, якія ўносяцца, прадугледжваюць зніжэнне стажу работы з выплатай абавязковых страхавых узносаў у бюджэт фонду для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце маці чатырох дзяцей (з 10 да 5 гадоў), павелічэнне тэрміну звароту па прызначэнне пенсіі (за месяц да ўзнікнення права на пенсію і на працягу аднаго месяца пасля ўзнікнення права на пенсію). Даецца права на датэрміновы выхад на пенсію бацькам дзяцей-інвалідаў (інвалідаў з дзяцінства) на 5 гадоў раней, калі маці не рэалізавала гэта права. Устанаўліваецца 30-гадовы перыяд, за які вызначаецца заробак для вылічэння пенсіі, і магчымасці выключэння з названага перыяду часу работы, калі не захаваліся дакументы аб заробку. Устанаўліваецца павышэнне да сацыяльнай пенсіі, якая атрымліваецца, працоўнай пенсіі па інваліднасці або з прычыны страты карміцеля дзецям-інвалідам і інвалідам з дзяцінства I і II групы, якія страцілі карміцеля ва ўзросце да 18 гадоў. Адмяняецца абмежаванне на памер пенсіі, якая выплачваецца пенсіянерам, якія працуюць. Пашыраецца пералік грамадзян, якія могуць атрымліваць пенсію праз аб'екты паштовай сувязі.

Таксама падчас сесіі дэпутатамі ратыфікаваны шэраг дакументаў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении **26 июня 2025 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 600/С-122808 общей площадью 24,4 кв. м (наименование: помещение насосной станции мазута; составные части и принадлежности: кирпичное здание помещения насосной станции мазута 3А1/к, с резервуарами под мазут а1) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,0774 га, кадастровый номер – 623650100001005578 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/3 |
| Начальная цена: 100 000,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 10 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **26 июня 2025 года в 11.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 11.06.2025 по 24.06.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону **(017) 388-43-21.**

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**



## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении электронных торгов по продаже права заключения договора аренды имущества, находящегося в республиканской собственности

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00126** по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Транспортное республиканское унитарное предприятие «Минское отделение Белорусской железной дороги», г. Орша, ул. Константина Заслонова, 3, тел. 80216503733.

**Организатор, Оператор ЭТП ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by**.

**Дата и время проведения торгов: 12.07.2025 в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.**
Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части капитального строения с инв. № 240/С-31265 (части площади пола), (наименование – здание вокзала) – площадь пола 1,0 кв. м на 1-м этаже по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Феликса Дзержинского, 8.

Целевое использование: размещение снекового вендингового автомата, вендингового автомата для детей, вендингового автомата по продаже средств гигиены и др. бытовых мелочей, банкомата или информационного терминала. Размер коэффициента спроса на недвижимое имущество, его техническое состояние и коммерческую выгоду от сдачи в аренду – 3,0.

**Нач. цена: 42,23 руб.**

Извещение о проведении торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/ (№ 31222), на сайте Витебского облисполкома https://vitebsk-region.gov.by/ru/Aukciony-ru

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Агролизинг», 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31, тел. +37517-242-13-81 |
| **Предмет аукциона** | |
| **Торговое помещение** 1672,1 кв. м, 610/D-47661. Адрес: **г. Борисов, ул. Строителей, д. 28, пом. 5** | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 2 122 286,00 бел. руб.** | |
| **Условия по лоту:** в случае признания победителем аукциона либо единственным участником, согласившимся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, хозяйствующего субъекта, до совершения сделки может потребоваться согласие антимонопольного органа (МАРТ) на экономическую концентрацию | |
| **Обременения по лоту:** площади частично сданы в аренду, находятся в залоге у ОАО «Банк развития Республики Беларусь». С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцати)** дней после проведения аукциона, а в случае необходимости получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию – **90 (девяносто)** дней | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена **в течение 30 (тридцати)** дней после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение по лоту опубликовано в газете «Звязда» от 16.05.2025 | |
разработать и утвердить в установленном законодательстве порядке в срок, не превышающий один год со дня возникновения права на земельный участок, проектно-сметную документацию для завершения строительства приобретенного незавершенного незаконсервированного капитального строения. Завершение строительства одноквартирного жилого дома осуществить на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

юридическому лицу в течение шести месяцев, а гражданину в течение одного года со дня утверждения проектно-сметной документации на строительство одноквартирного жилого дома приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;

снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно строительному проекту;

соблюдать права и обязанности землепользователя, предусмотренные статьями 84 и 85 Кодекса Республики Беларусь о земле.

ІМЁНЫ

# «ГАЛОЎНАЕ — ВЕРЫЦЬ У СЯБЕ І НЕ БАЯЦЦА ЦЯЖКАСЦЯЎ»

## Пра творчасць і падрыхтоўку да галоўнага музычнага конкурсу краіны расказвае Лера БЕРНАТОВІЧ

Усяго за некалькі гадоў гэта мініяцюрная дзяўчына з моцным голасам прайшла шлях ад удзельніцы дзіцячых конкурсаў да пераможцы нацыянальнага адбору «Славянскага базару». І сёлета яна прадставіць Беларусь на XXIV Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск 2025».

### ПРА СТАРТ ТВОРЧАЙ КАР'ЕРЫ

***— Лера, якімі былі першыя крокі ў музыцы?***

— Я нарадзілася і вырасла ў Мінску, з маленства займалася танцамі, і толькі ў 9 гадоў папрасіла бабулю адвесці мяне на вакал. Цікава, што зрабіла яна гэта ўпотайкі ад мамы. Трапіла да выдатнага выкладчыка, у якога і займалася каля 10 гадоў. Даныя ў мяне былі нядрэнныя, таму хутка пачаліся розныя конкурсы. Пасталеўшы, вырашыла паступаць у Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў. Цяпер вучуся на трэцім курсе спецыяльнасці «Мастацтва эстрады», па якой я, дарэчы, не толькі артыст, але і педагог па вакале. Ужо цяпер працую з дзецьмі, і мне гэта вельмі падабаецца. Магчыма, пазней буду сумяшчаць выступленні на сцэне і выкладанне — адно другому не перашкаджае.

***— Памятаеце сваё першае выступленне?***

— Мне тады было 9 гадоў, і я стала лаўрэатам другой ступені на міжнародным конкурсе. Выконвала песню «Мар», з якой Даяна Кірылава выступала на «Дзіцячым Еўрабачанні — 2013». Усе вельмі перажывалі, асабліва мама. Яна ездзіла са мной на ўсе канцэрты і конкурсы, заўжды знаходзілася побач, дапамагала. Без яе падтрымкі было б значна цяжэй.

### КАМПРАМІС ДЗЕЛЯ ВЫНІКУ

***— Калі да вас прыйшла першая папулярнасць?***

— Напэўна, калі трапіла ў музычную медыякампанію. Я тады вучылася на першым курсе каледжа, і да нас прыехалі з кастынгам — шукалі дзяўчыну ў дуэт. З некалькіх прэтэндэнтак выбралі мяне. Так пазнаёмілася з Арцёмам Скаролем. Мы пасябравалі і пачалі шмат працаваць разам: запісваць песні, здымаць кліпы, выступаць на буйных пляцоўках па ўсёй краіне. Цяпер у нашым рэпертуары прыкладна 5-6 песень, а яшчэ вялікая колькасць кавераў — іх можна паслухаць у нашых сацыяльных сетках.

***— У якіх жанрах працуе ваш дуэт?***

— У асноўным выконваем поп-музыку, шмат патрыятычных кампазіцый. Напрыклад, песню «Што ты зрабіў для Радзімы» кожны раз неверагодна цёпла прымаюць слухачы. Гэта, напэўна, наш галоўны хіт — яго любяць і моладзь, і дарослыя. А яшчэ Арцём сам піша музыку. Магчыма, калі-небудзь мы выпусцім што-небудзь у яго аўтарскім стылі. Я таксама спрабавала нешта ствараць, але пакуль гэта хутчэй накіды, яшчэ не планую іх публікаваць.

***— У вас з Арцёмам бываюць творчыя рознагалоссі?***

— У любым дуэце часам бываюць спрэчкі. Мы з Арцёмам вельмі розныя: я энергічная, эмацыянальная, а ён — спакойны і ўраўнаважаны. Але, як мне здаецца, у гэтым і ёсць наша сіла, бо мы дапаўняем адно аднаго. Часам Арцём, як сапраўдны джэнтльмен, саступае. Але ў асноўным заўсёды знаходзім кампраміс.

### «МАРАФОН АДЗІНСТВА» І «СЛАВЯНСКІ БАЗАР»

***— Ваш дуэт удзельнічаў у «Марафоне адзінства». Чым запомніўся гэты перыяд?***

— З кастрычніка да студзеня мы практычна жылі ў раз'ездах — кожны тыдзень па тры дні ў розных гарадах. Усяго наведалі, калі не памыляюся, 17 населеных пунктаў. Паралельна былі спікерамі на «НЯсумных НЯлекцыях», правялі 41 сустрэчу, дзе расказвалі навучэнцам каледжаў пра свой творчы шлях, раілі выбіраць тое, да чаго ляжыць душа, слухаць сваё сэрца. А яшчэ падчас «Марафону» мы пазнаёміліся з рознымі таленавітымі артыстамі, падтрымліваем з імі сувязь.

***— З поспехам сумяшчаецце такую актыўную дзейнасць з вучобай?***

— Не заўсёды. Напрыклад, быў такі выпадак. Арцём вучыцца ў БДУКМ, і яго сесія прыпала якраз на дні правядзення «Марафону адзінства» ў Мінску. Ён тады мне сказаў: «Лера, магчыма, я не паспею. Не ведаю, як доўга будзе ісці экзамен». Я сяджу перад пачаткам чарговай сустрэчы і разумею: гэту давядзецца весці адной. А мы ўжо прывыклі ўсё рабіць удваіх. Але, дзякуй богу, ён прыехаў-такі — паспеў літаральна за 5 хвілін да пачатку. Была і адваротная сітуацыя. Іншая «НЯлекцыя» зацягнулася, а мне трэба было тэрмінова ехаць на адборачны тур «Славянскага базару».



***— А як вы надумалі ў ім удзельнічаць?***

— Шчыра кажучы, гэта было вельмі спантаннае рашэнне. Мне проста хацелася паспрабаваць свае сілы, паглядзець, на што здольная. Да гэтага ўдзельнічала ў асноўным у дзіцячых конкурсах, а ў дарослых — ніколі. Убачыла інфармацыю пра падачу заявак на «Славянскі базар», падумала: «А чаму б і не?» Прайшла першы тур, потым — другі... На гэтым этапе далучылася мая каманда.

***— Што для вас важней: любоў гледачоў або прызнанне прафесіяналаў?***

— Складанае пытанне. Калі б прыйшлося, я выбрала б першае. Мне здаецца, што мы, артысты, ідзём у гэту прафесію не па рэгаліі, а каб дарыць людзям эмоцыі, энергію, часцінку сваёй творчасці.

**Аміна НАЗАРАВА.**

**Фота дадзена гераіняй.**


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Лепельпромшвеймебель»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1819 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-15134 (назначение – Здание неустановленного назначения, наименование – Компрессорная, общая площадь – 33,0 кв. м). Оборудование: трансформатор ТМГ-400/10 – 2 шт. | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1 | 8730,00 | 873,00 | 436,50 |
| 1820 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-8896 (назначение – Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – Пилорама, общая площадь – 530,2 кв. м). Оборудование: пилорама Р-6-4 | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1 | 9510,00 | 951,00 | 475,50 |
| 1842 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-15135 (назначение – Здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – Котельная, общая площадь – 207,0 кв. м); Насос ТОПС 50/15, инв. 679; Насос в котельной, инв. 509; Насос ИРЛ 65/115-1,5 12, инв. 690 | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1 | 11403,36 | 1140,34 | 570,17 |
| **Лот** | **Наименование** | | **Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
| 1843 | Геран Люкс ПГУ-1-100, инв. 949; Геран ПГУ-1-300, инв. 950; Геран ПГУ-С-153. инв. 951 | | 614,40 | 61,44 | 30,72 |
| 1844 | Парогенератор Gold Eagle DL-7, инв. 952; Стол Gold Eagle DL-1068 | | 158,40 | 15,84 | 7,92 |
| 1846 | Плоттер JETLINK-180 N, инв. 923 | | 48,00 | 4,80 | 2,40 |

В отношении лотов №№ 1819, 1820 проводятся седьмые повторные торги.
**Стоимость снижена на 75 %.**
В отношении лотов №№ 1842–1844, 1846 проводятся шестые повторные торги.
**Стоимость снижена на 60 % в отношении лота № 1842.**
**Стоимость снижена на 80 % в отношении лотов №№ 1843, 1844, 1846.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 17.05.2025

**Местонахождение лотов №№ 1843, 1844, 1846:**
Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Володарского, 1

Лоты №№ 1819, 1820, 1842 расположены на земельном участке с кадастровым номером 241200000001000283, площадь – 0,9829 га, назначение – Земельный участок под производственную базу. Земельный участок является неделимым, предоставлен на праве аренды. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в охранной зоне реки, водоема), код – 2,4, площадь – 0,9829 га. На часть земельного участка имеется сервитут

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **23 июня 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 10 июня 2025 года до 16.00 19 июня 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Лепельпромшвеймебель», проводимых 23.06.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1842 – 7 %, по лотам №№ 1819, 1820 – 8 %, по лотам №№ 1843, 1844, 1846 – 10 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать (заключить) с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней (по лотам №№ 1843, 1844, 1846) и в течение 20 (двадцати) рабочих дней (по лотам №№ 1819, 1820, 1842) со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней (по лотам №№ 1843, 1844, 1846) и не позднее 30 календарных дней (по лотам №№ 1819, 1820, 1842) со дня заключения договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Ирина Сигизмундовна, +375298903354. Дополнительная информация по предмету торгов по тел. +375293058650, Алена.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Лепельпромшвеймебель» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: 8 (017) 255-29-28, 8 (029) 304-59-90; e-mail: kp@p-k.by (211180, Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Володарского, д. 1, УНП 300038815)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# НЕ КІЕМ, ДЫК ПАЛКАЙ...

## Ці зменіць нешта ў польскім грамадстве «вотум даверу» ўраду Туска?

Цікавае кіно пачынае разгортвацца ў польскім каралеўстве. Нядаўна абраны прэзідэнтам Польшчы прадстаўнік апазіцыйнай да дзейнай улады партыі «Права і справядлівасць» Караль Наўроцкі яшчэ не прайшоў інаўгурацыю, але паспеў зрабіць шэраг гучных заяў, ад чаго ў польскім грамадстве пачынае разгортвацца бурная дыскусія.



Днямі Наўроцкі назваў Туска найгоршым прэм'ерам Польшчы за апошнія 36 гадоў.

У прыватнасці, Дональда Туска ён лічыць найгоршым прэм'ер-міністрам краіны з 1989 года. Пра гэта ён заявіў у інтэрв'ю Telewizja Republika, паведамляе БелТА са спасылкай на газету «Известия».

«Улічваючы маю вельмі крытычную ацэнку Дональда Туска, якая нікога не здзіўляе, і той факт, што я лічу яго, безумоўна, найгоршым прэм'ер-міністрам Польшчы пасля 1989 года, было б дробязна выліваць гэтыя эмоцыі ў пытанне аб тым, ці будуць палякі ў бяспецы або ці будзе Польшча развівацца», — сказаў Караль Наўроцкі.

Новаабраны прэзідэнт Польшчы перакананы, што дзейны ўрад не спраўляецца з кіраўніцтвам краінай. Ён таксама паабяцаў падтрымліваць усе ініцыятывы, якія будуць мець станоўчыя наступствы для грамадзян краіны.

«Гэта дрэнны ўрад, які не можа кіраваць. Гэта не мяняе таго факта, што мне давядзецца працаваць з гэтым урадам. І ўсе добрыя рэчы, якія служаць палякам, будуць мець маё адабрэнне», — заявіў палітык.

Наўроцкі таксама параіў Туску падумаць, як ён будзе супрацоўнічаць з новым кіраўніком дзяржавы.

Усе гэтыя заявы гучаць недвухсэнсоўна, асабліва на фоне таго, што напярэдадні ў польскі Сейм паступіла хадайніцтва ад Туска па пытанні аб разглядзе вотуму даверу ўраду. Спікер Сейма Польшчы Шымон Халоўня (яшчэ адзін экс-кандыдат у прэзідэнты, які не прайшоў у другі тур прэзідэнцкіх выбараў) прапанаваў разгледзець пытанне аб вотуме даверу ўраду на дадатковай сесіі Сейма. Яна павінна адбыцца ў сераду, 11 чэрвеня.

«Я хачу, каб усе ўбачылі, уключаючы нашых апанентаў унутры краіны і за мяжой, што мы гатовыя да гэтай сітуацыі, што мы разумеем усю сур'ёзнасць моманту, але што мы не маем намеру рабіць ні кроку назад», — цытуе заяву Туска выданне Onet.

Рашэнне аб вотуму даверу ўраду ажыццяўляецца большасцю галасоў у прысутнасці не менш чым паловы ад устаноўленай законам колькасці дэпутатаў. Як адзначае польскае выданне, калі гэта галасаванне будзе прайграна, ураду прыйдзецца сысці ў адстаўку, а вынік галасавання зусім не відавочны.

Брытанская The Independent напісала з гэтай нагоды: «галасаванне заклікана паказаць, што шырокая і цяжкакіравальная кааліцыя Туска застаецца адзінай, нягледзячы на паразу на прэзідэнцкіх выбарах, якая прывяла да прагнозаў аб магчымым падзенні ўрада і правядзенні датэрміновых парламенцкіх выбараў».

Але гэта далёка не ўсе «ініцыятывы» новаспечанага прэзідэнта Польшчы. Днямі Караль Наўроцкі выказаўся супраць уступлення Украіны ў Еўрапейскі саюз. Пра гэта інфармуе газета «Известия» са спасылкай на заяву палітыка.

«Я супраць уступлення Украіны ў Еўрасаюз на гэты момант», — заявіў Наўроцкі 7 чэрвеня ў інтэрв'ю венгерскаму Youtube-каналу Mandiner.

Таксама ён адзначыў, што Польшчы як дзяржаве «трэба падтрымліваць Украіну са стратэгічнага і геапалітычнага пунктаў гледжання», паўтарыўшы ключавы падыход ЕС да Расіі як да нібыта «пагрозы» для рэгіёна.

На думку Наўроцкага, украінскія ўлады павінны разумець, што ў такіх еўрапейскіх дзяржаў, як Польшча і Венгрыя, «ёсць свае інтарэсы». У якасці прыкладу палітык прывёў эксгумацыю палякаў — ахвяр Валынскай разні.

«Мы павінны знайсці кампраміс, кансэнсус, таму я вельмі ганаруся Украінай. Аднак інтарэсы іншых краін, якія падтрымлівалі Украіну, таксама павінны быць выкананы», — адзначыў Наўроцкі.

Раней, 2 чэрвеня, выданне The Conversation паведамляла, што пасля перамогі на прэзідэнцкіх выбарах Наўроцкага Польшча можа спыніць падтрымку Украіны.

**Андрэй САВІНЫХ, намеснік старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі, дыпламат,** у эфіры тэлеканала СТБ так выказаўся з гэтай нагоды:

— Да ўлады прыйшоў больш кансерватыўны палітык, які выступае ў большай ступені за кансерватыўныя каштоўнасці. Але ступень яго ўплыву, з майго пункту гледжання, не трэба перабольшваць. Справа ў тым, што палітычная сістэма Польшчы, як і любой еўрапейскай краіны, пабудавана такім чынам, што цэнтры прыняцця рашэнняў вынесены ўжо з нацыянальных дзяржаў у Брусель ці, давайце будзем казаць адкрыта, у Вашынгтон. Таму я мяркую, што пры больш разумнай палітыцы ён не зможа ўсё роўна кіраваць прэм'ер-міністрам, які застаецца і ўяўляецца еўраатлантыстам, умоўна кажучы, назавём так.

Другі момант, на які звяртае ўвагу эксперт:

— Вядома, можа быць, Польшча стане больш арыентавацца не на Брусель, а на Злучаныя Штаты Амерыкі. Але ў мяне ў канчатковым выніку ўзнікае вельмі простае пытанне: а нам якая розніца? І той, і іншы палітык будзе праводзіць, у прынцыпе, антырускую і антыбеларускую палітыку. І гэта, на жаль, пакуль тая рэальнасць, якая існуе. Пакуль у Еўропе не адбудзецца перазагрузкі палітычных эліт, як гаворыцца, не кіем, дык палкай, сур'ёзна нічога не зменіцца.

Тэма змены палітычных эліт у Польшчы турбуе і нашых збеглых, у асяроддзі якіх прагназуецца пагаршэнне адносін да беларускіх мігрантаў. Яны агучваюць сваё расчараванне палітычным жыццём у Польшчы і выказваюць асцярогу, што рашэнне па «вотуме даверу» ўраду Туска польскія парламентарыі могуць правалiць, што адкрые дарогу для прыходу ў Сейм ультраправых палітыкаў. А што пасля гэтага чакае нашых збеглых? Думаецца, мала чаго добрага.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов:** Открытое акционерное общество «Борисовдрев», 222520, Минская область, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 18, тел. 80177758531.
**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Торги проводятся 23.06.2025** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by. Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Наименование предмета торгов, его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальные строения (административное здание № 1, механические мастерские с тамбуром, уборная на Л/П, склад з/частей на автобазе, пожарный пост, архив, мастерская для плотницких работ, мастерские кирпичные, котельная с душевой, гараж со сварочным постом, склад кирпичный, столовая); Минская обл., Логойский р-н, Плещеницкий с/с, г. п. Плещеницы, ул. Октябрьская, 47, 47Б | Производственная база в составе: административное здание № 1 с элементами благоустройства, сетью водопровода и сетью электроснабжения (601/С-34904, 149,3 кв. м, составные части: две пристройки), механические мастерские с тамбуром (601/С-34903, 89,3 кв. м, составные части: тамбур), уборная на Л/П (601/С-34902, 7,5 кв. м), склад з/частей на автобазе (601/С-34901, 100,1 кв. м), пожарный пост (601/С-34900, 22,6 кв. м), архив (601/С-34899, 24,4 кв. м), мастерская для плотницких работ (601/С-34898, 51,1 кв. м), мастерские кирпичные (601/С-34897, 42,3 кв. м, составные части: навес), котельная с душевой (601/С-34896, 130,8 кв. м), гараж со сварочным постом (601/С-34895, 731,0 кв. м, составные части: мансардный этаж), склад кирпичный (601/С-14317, 47,7 кв. м), столовая (601/С-14308, 133,4 кв. м, составные части: холодильник, пищеблок, обеденный зал, буфет, холодная пристройка) | 140 179,20 | 14 017,92 |

**Продавец:** *ОАО «Борисовдрев», Минская обл., г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 18; тел. 80177739688 (Федюкович Мария Николаевна).*

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 18.06.2025, до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Сроки возмещение затрат на организацию и проведение торгов:** *Победитель электронных торгов (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.*

**Сроки и условия заключения договора:** *не позднее 10 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов*



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
## по продаже права заключения договоров аренды открытых площадок с покрытием

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44** | | |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **24.06.2025, 12.00, актовый зал ОАО «Солигорскторг»** | | |
| | **Лот № 1** | **Лот № 2** | **Лот № 3** |
| **Предмет аукциона** | **Право заключения договора аренды открытой площадки с покрытием** | **Право заключения договора аренды открытой площадки с покрытием** | **Право заключения договора аренды открытой площадки с покрытием** |
| **Общая площадь, кв. м** | 10 | 60 | 72 |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 63, район магазина № 35 | Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 63, район магазина № 35 | Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 63, район магазина № 35 |
| **Целевое использование имущества** | Организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения нестационарного торгового объекта по реализации плодоовощной продукции | Организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения детских аттракционов | Организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения нестационарного объекта общественного питания |
| **Условия аукциона** | До подачи заявления на участие в аукционе необходимо согласовать с начальником отдела архитектуры и строительства райисполкома (Макей С. В.) и (или) с отделом торговли и услуг райисполкома (Томка Т. С.) внешний вид, цветовое решение и рекламное оформление объекта; обеспечить функционирование объекта в соответствии с указанным целевым использованием; обеспечить содержание объекта и прилегающей территории в соответствии с санитарными нормами и правилами; обеспечить наличие документов, подтверждающих безопасность эксплуатации объекта согласно установленным правилам (при необходимости); обеспечить подключение объекта к источнику электроэнергии (при необходимости); обеспечить подвод воды и канализации к объекту в соответствии с санитарными нормами и правилами (при необходимости); установить контейнер и заключить договор со специализированным предприятием на вывоз мусора (при необходимости); установить биотуалет (при необходимости); обеспечить сохранность зеленой зоны в случае расположения объекта в непосредственной близости к ней; по истечении срока договора аренды открытой площадки с покрытием произвести демонтаж объекта и восстановить благоустройство, нарушенное за время работы объекта | | |
| **Начальная цена права заключения договора аренды объекта, бел. руб.** | 46,93 | 281,55 | 337,86 |
| **Сумма задатка, бел. руб.** | 46,93 | 281,55 | 337,86 |
| **Срок договора аренды** | 3 года | 3 года | 3 года |
| **Размер арендной платы в месяц, базовые арендные величины** | Ежегодно с 01.04 по 31.10 – 43 БАВ в месяц; с 01.11 по 31.03 – 2 БАВ в месяц | Ежегодно с 01.05 по 30.09 – 45 БАВ в месяц; с 01.10 по 30.04 – 2 БАВ в месяц | Ежегодно с 01.05 по 30.09 – 54 БАВ в месяц; с 01.10 по 30.04 – 2 БАВ в месяц |
| **Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона в предусмотренных законодательством случаях, бел. руб.** | 4 200,00 | 4 200,00 | 4 200,00 |

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44, финансовый отдел, с 08.00 до 16.00 по рабочим дням **по 20 июня 2025 г. включительно,** телефоны: **8 (0174) 26 07 31, 23 65 26.** Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by (https://au.nca.by),** Солигорского районного исполнительного комитета – www.soligorsk.gov.by (Главная/Экономика и бизнес/Инвестору/Аукционы), открытого акционерного общества «Солигорскторг» – **www.soligorsktorg.by** (Главная/Аукционы)

СПОРТ-ТАЙМ

# СПАБОРНІЦТВЫ БЕЛАРУСКІЯ — ВЫНІКІ СУСВЕТНЫЯ

## Чым парадавалі лёгкаатлеты



Фота БФЛА.



На мінулым тыдні сталіцай беларускай лёгкай атлетыкі стаў Брэст. У горадзе над Бугам прайшло адразу некалькі важных стартаў — адкрыты лёгкаатлетычны турнір «Мы разам», а таксама адкрыты чэмпіянат Беларусі па мнагабор'ях. Вынікі спаборніцтваў парадавалі, нават здзівілі, а паколькі летні лёгкаатлетычны сезон толькі пачынаецца, далі надзею.

Напрыклад, у сектары для скачкоў у вышыню Лізавета Валуева перамагла з вынікам 1,91 метра — і гэта яе лепшы вынік у сезоне. Спартсменка спрабавала ўзяць і 1,93 метра, але не здолела. Што ж, у яе яшчэ ёсць час. У мужчын вышэй за ўсіх узляцеў Ягор Гуптор, якому ўдалося з першай спробы паўтарыць свой леташні асабісты рэкорд — 2,24. Ягор таксама паказаў здольнасці скокнуць і на 2,28, але планка не выстаяла.

У сектары для скачкоў у даўжыню сустрэліся лідары ў гэтай дысцыпліне. І тут усё было амаль што прадказальна. Далей за ўсіх скокнуў Аляксей Дудзінскі — на 7,88. У жанчын аднолькавы вынік — 6,26 — паказалі 16-гадовая Ком Крыстал Шэнан і 20-гадовая Анастасія Дрозд, але па другой лепшай спробе перамога дасталася Ком Крыстал Шэнан. Дарэчы, вынік у 6,26 метра — гэта пятае месца ў сусветным рэйтынгу ва ўзроставай групе U18. Дуэль паміж Анастасіяй Дрозд і Ком Крыстал Шэнан паўтарылася і ў сектары для трайнога скачка. У першай спробе Анастасія ўстанавіла ўласны рэкорд — 13,84 метра. Дарэчы, такія лічбы — гэта другі радок еўрапейскага рэйтынга U23, што і прынесла ёй перамогу. Нацыянальны рэкорд у гэтай дысцыпліне з вынікам 13,30 перапісала Ком Крыстал Шэнан, тым самым спартсменка ўмацавала сваё чацвёртае месца ў сусветным рэйтынгу U18. Мужчыны таксама парадавалі добрымі вынікамі ў трайным скачку. Перамог Максім Несцярэнка, якому на гэты раз удалося зрабіць толькі адну заліковую спробу — на 16,73. На другім месцы — юніёр Цімур Северaў: 16,24 метра. А да гэтага ён скокнуў 16,18 метра, што з'яўляецца лепшым вынікам сярод спартсменаў узроставай групы U20 у Еўропе і пятым — у свеце.

У рамках чэмпіянату краіны па мнагабор'ях асабісты рэкорд па суме сямібор'я ўстанавіла Юлія Роут, якая набрала 5949 ачкоў. «У маім активе на сёння сем відаў, праведзеных за два дні, з іх — пяць асабістых рэкордаў. Па сутнасці, гэта выдатны вынік, як і сума, таму што асабісты рэкорд — гэта заўсёды прыемна. У мяне такі сімвалічны нумар гэтым разам — 60. Так хацелася дамаляваць гэтыя нулікі, адзінкі пасля, але сёння гэта не ўдалося. Я вельмі радуюся, ваю, што праз месяц у мяне не будзе такога нумара, але з'явіцца такая сума. Я ўжо доўга да яе імкнуся, і сёння, у прынцыпе, яна б склалася, але трошкі не хапіла ўдачы, спадарожнага ветру. У цэлым, я гатовая да 6000 ачкоў, нават больш. Рызыкну ў наступны раз замахнуцца на гэту суму», — падзялілася сваімі ўражаннямі Юлія.

У мужчын пераможцам стаў Дзяніс Самандык, у актыве якога 6896 ачкоў па выніках дзесяцібор'я.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

НАДВОР'Е

# ТЫДЗЕНЬ ПАЧАЎСЯ З ПАХАЛАДАННЯ

## Наперадзе моцны вецер і навальніцы



«Паветраныя патокі змяняюць свой напрамак з паўднёва-заходняга на паўночна-заходні, і ў краіну паступае прахаладнае паветра. Тэмпературны фон панізіцца», — паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўмовы надвор'я ў Беларусі ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, днём адаб'еца ўплыў няўстойлівай паветранай масы. Пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, днём месцамі ў паўночных раёнах краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёва-заходні, заходні ўмераны, ночу — парывісты, у асобных раёнах па поўначы — моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы 5—11 °С, днём — ад 16 °С да 22 °С.

У сераду ноччу на захадзе, раніцай і днём у многіх раёнах краіны адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з тэрыторыі Польшчы. Воблачна, ноччу з праясненнямі. Уначы пераважна па заходняй палове, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць дажджы. Днём месцамі магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер пераменных напрамкаў умераны, днём месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 6 °С па ўсходзе да 14 °С па паўднёвым захадзе краіны. Днём чакаецца ад 14 °С да 21 °С.

У чацвер умовы надвор'я працягне вызначаць франтальны раздзел, які павольна перамяшчаецца ва ўсходнім напрамку. Воблачна. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, днём месцамі магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўночна-заходні ўмераны, днём — парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ноччу складзе 7—13 °С. Днём будзе ад 12 °С да 19 °С, па паўднёвым захадзе Беларусі — да 21 °С.

# Надвор'е на заўтра

| | | |
| --- | --- | --- |
| МІНСК | 759 мм рт.сл. | +11..+13°С / +14..+16°С |
| ВІЦЕБСК | 761 мм рт.сл. | +9..+10°С / +17..+18°С |
| МАГІЛЁЎ | 760 мм рт.сл. | +10..+11°С / +18..+19°С |
| ГОМЕЛЬ | 761 мм рт.сл. | +12..+13°С / +18..+20°С |
| ГРОДНА | 759 мм рт.сл. | +12..+13°С / +16..+18°С |
| БРЭСТ | 759 мм рт.сл. | +13..+14°С / +16..+17°С |

Паводле даных Белгідрамета

## Месяц

*Першая чвэрць 03.06—10.06. Месяц у сузор'і Стральца.*

## Геамагнітныя ўзрушэнні




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

## ...у суседзяў

| | |
| --- | --- |
| МАСКВА | +20..+22°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +17..+19°С |



З юбілеем, з прыгожай круглай датай шчыра віншуем шаноўную калляжанку **Ірыну Генадзеўну ЛЁША**! Зычым моцнага здароўя, спору і плёну ва ўсіх вашых справах, шчасця ў асабістым жыцці!

*На многія леты ўдачы, дабра!*
*Хай кожны дзянёк будзе ў свята!*
*Хай дом за вярсту абыходзіць бяда,*
*А радасці будзе багата!*

**Звяздоўцы.**

## 10 ЧЭРВЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1067** год — Яраславічы захапілі ў палон полацкага князя Усяслава Брачыславіча і двух яго сыноў падчас сустрэчы на рацэ Ршы (Аршыца).

**1812** год — урачыстае адкрыццё Полацкай езуіцкай акадэміі, якая была ўраўнавана да ўніверсітэта. Са сцен акадэміі пачалі свой шлях гісторык і археолаг Канстанцін Тышкевіч, пісьменнік Ян Баршчэўскі, жывапісец Валянцін Ваньковіч. Бібліятэка навучальнай установы налічвала больш за 40 тысяч тамоў і з'яўлялася найбагацейшым кнігазборам у Беларусі. Сярод старажытных і рэдкіх кніг у бібліятэцы збярагаліся таксама і старажытныя рукапісы, каралеўскія граматы і іншыя дакументы, дысертацыі, энцыклапедычныя выданні і дапаможнікі па асобных дысцыплінах.

**1906** год — нарадзіўся Антон Брынскі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі, пісьменнік. Герой Савецкага Саюза. З кастрычніка 1941 года — камандзір спецатрада НКДБ, які дзейнічаў на чыгунцы Орша—Барысаў, Брэсцкім, Баранавіцкім і Лунінецкім чыгуначных вузлах. Аўтар кніг «Па той бок фронту», «Баявыя спадарожнікі мае», «Дзяўчынка з Мар'інага гаю».

**1956** год — афіцыйна адкрыта Заслаўскае вадасховішча (Мінскае мора). У 1977 годзе рэканструявана і добраўпарадкавана. На берагах размешчаны санаторна-курортны комплекс «Юнацтва», прафілакторыі, базы для аматараў-рыбаловаў, спортбазы, дзіцячыя аздараўленчыя лагеры.

У свеце

**1909** год — пасажырскі карабель «Славонія», які пацярпеў катастрофу каля Азорскіх астравоў, упершыню ў свеце выкарыстаў сігнал SOS.

**1943** год — венгр Ласла Біра запатэнтаваў шарыкавую ручку.

**1967** год — на Блізкім Усходзе завяршылася Шасцідзённая вайна. У гэтай вайне Ізраіль у лічаныя дні дасягнуў перамогі, захапіўшы Сінайскі паўвостраў, сектар Газа, Заходні бераг ракі Іардан, Усходні Іерусалім і Галанскія вышыні. Зялёная рыса 1949 года стала адміністрацыйнай мяжой паміж Ізраілем і новымі тэрыторыямі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 934 Індэкс 63850. Зак. № 1306.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 чэрвеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12